**Чванаў Л.**

# ЗА РАДЗІМУ

У жорсткіх і крывапралітных баях за сталіцу нашай Радзімы з гітлераўскімі полчышчамі змагаліся многія сыны і дочкі савецкага народа, прадстаўнікі ўсіх народаў нашай вялікай і магутнай краіны. У іх радах былі прадстаўнікі Магілёўшчыны.

Сярод іх знаходзіўся і сын селяніна з вёскі Ізабеліна Кіраўскага раёна Рыгор Аляксандравіч Худалееў. Вайсковую службу пачаў радавым артылерыйскага палка ў Віцебску. Тут уступіў у камсамол, а ў 1926 годзе яго прынялі ў рады Камуністычнай партыі. Вучыўся ў Мінскай аб'яднанай ваеннай школе імя М. І. Калініна. Затым капітан Худалееў удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі.

Вялікая Айчынная вайна застала яго на пасту начальніка штаба артпалка 152-міліметровых пушак паблізу станцыі Лясная пад Баранавічамі. З гэтага рубяжа і далі першыя залпы па фашыстах. Потым былі Нясвіж, Слуцк, Беразіно.

Вельмі цяжкім быў бой на адным з абарончых рубяжоў на рацэ Друць 4 ліпеня 1941 года. Тут асабліва вызначыўся камандзір дывізіёна, капітан Варыс Львовіч Хігрын, ураджэнец Оршы. Пасля гібелі наводчыка капітан сам з пушкі падбіў чатыры фашысцкіх танкі. Б. Л. Хігрыну пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Мужна абараняўся полк у раёне Доўска. Некалькі разоў ён трапляў у акружэнне, але дзякуючы. стойкасці байцоў і ініцыятыве камандзіраў, кожны раз паспяхова выходзіў з цяжкага становішча.

– Савецкія воіны навучыліся весці манеўраны бой агнём і коламі, – гаварыў Рыгор Аляксандравіч аўтару гэтых радкоў. – Навучыліся весці агонь прамой наводкай, гэта значыць, страляць па праціўніку, яго танках у непасрэднай блізкасці. Гэта стала звычайнай справай.

У верасні 1941 года маёра Р. А. Худалеева прызначаюць камандзірам 888 артылерыйскага палка 326 стралковай дывізіі. Пад яго камандаваннем полк абараняў сталіцу Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнткаў, а затым вызваляў ад іх тэрыторыю Падмаскоўнага вугальнага раёна, гарады Сухінічы, Белеў, Казельск, сяло Бураціна. За баявыя подзвігі многія воіны былі адзначаны ўзнагародамі. Маёру Худалееву ўручылі тады ордэн Чырвонага Сцяга і медаль "За абарону Масквы".

Сталіцу нашай Айчыны абаранялі таксама іншыя воіны з Магілёўшчыны. Сярод іх камандзір батарэі лейтэнант Мітрафан Цітавіч Лосеў, палкоўнік Рыгор Іванавіч Сініцын, старшы лейтэнант Іван Сямёнавіч Хруцкі, генерал-маёр Антон Іванавіч Якімовіч.

Гэта танкісты Ф. С. Шутаў, І. І. Гусакоўскі, І. І. Якубоўскі, якім за подзвігі ў гады вайны прысвоена званне двойчы Героя Савецкага Саюза.

Неба Масквы абаранялі мужныя лётчыкі. Сярод іх былі лётчыкі-выпрабавальнікі новых тыпаў самалётаў Пётр Міхайлавіч Сцефаноўскі і Сяргей Пятровіч Алейнікаў...

У жніўні 1942 года Рыгор Аляксандравіч прызначаецца начальнікам артылерыі 306 стралковай дывізіі. Яму выпаў вялікі гонар вызваляць родную беларускую зямлю ад фашысцкай погані. Шмат складаных рубяжоў ворага пераадолелі нашы воіны. Нялёгкім было і фарсіраванне Заходняй Дзвіны ў раёне Бешанковіч. Пераправай артылерыйскіх батарэй кіраваў сам палкоўнік Худалееў. Мужнасць байцоў стралковых батальёнаў, умелае кіраўніцтва баямі дазволілі нашым захапіць, утрымаць, а затым і расшырыць важны плацдарм. Фарсіраванне ракі дало магчымасць дывізіям 43 і 39 армій акружыць варожы корпус у саставе пяці пяхотных дывізій. За віцебскі "кацёл" 145 воінаў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Сярод іх быў і Р. А. Худалееў.

**Чванаў, Л. За радзіму / Л. Чванаў // Кіравец (Кіраўск). — 1986. — 29 лістапада. — С. 2.**